М. І. Свістунова, Г. К. Ціванова

# ГІСТАРЫЧНАЯ МАРФАЛОГІЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Матэрыялы для практычных
заняткаў студэнтаў
філалагічных спецыяльнасцей

У дзвюх частках

Частка 1

## ІМЕННЫЯ ЧАСЦІНЫ МОВЫ

МІНСК
2008

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
Кафедра гісторыі беларускай мовы

М. І. Свістунова, Г. К. Ціванова

# ГІСТАРЫЧНАЯ МАРФАЛОГІЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Матэрыялы для практычных
заняткаў студэнтаў
філалагічных спецыяльнасцей

У дзвюх частках

Частка 1

## ІМЕННЫЯ ЧАСЦІНЫ МОВЫ

МІНСК
2008

УДК 811.161.3’366’0(075.8)
ББК 81.2 Беи
С 24

Рэкамендавана
навукова-метадычным саветам
філалагічнага факультэта БДУ
23 студзеня 2008 г., пратакол № 5;
кафедрай гісторыі беларускай мовы
філалагічнага факультэта БДУ
16 студзеня 2008 г., пратакол № 6

Р э ц э н з е н т
кандыдат філалагічных навук дацэнт
Беларускага дзяржаўнага педагагічнага
універсітэта імя Максіма Танка *М. М. Круталевіч*

**Свістунова, М. І.**
С24 Гістарычная марфалогія беларускай мовы: матэрыялы для практычных заняткаў студэнтаў філал. спец. У 2 ч. Ч. 1 : Іменныя часціны мовы / М. І. Свістунова, Г. К. Ціванова. – Мінск : БДУ, 2008. – 65 с.

Дапаможнік прызначаны для аўдыторнай і самастойнай работы студэнтаў пры вывучэнні раздзела марфалогіі ў межах курса гістарычнай граматыкі беларускай мовы. Прапанаваныя заданні могуць выкарыстоўвацца таксама для падрыхтоўкі да тэсціравання ў САП E-University.

**УДК 811.161.3’366’0(075.8)**
**ББК 81.2 Беи**

© Свістунова М. І., Ціванова Г. К., 2008
© БДУ, 2008

# НАЗОЎНІК

## Катэгорыя роду назоўнікаў

### ВАРЫЯНТ І

#### Заданне 1

*Выберыце правільны адказ:*

Катэгорыя роду назоўнікаў у агульнаўсходнеславянскай мове з’яўлялася універсальнай граматычнай катэгорыяй.

A) так; B) не.

#### Заданне 2

*Запішыце словы, з дапамогай якіх вызначаецца род падкрэсленага назоўніка:*

**ащели не имашь чимъ заплатити, и ꙗкий бы то был^s^ дивъ во^з^мет ли одеждꙋ с коморы твоеꙗ** (Скар., ПС, 34 б).

#### Заданне 3

*Выберыце правільны адказ:*

**Богъ великии сил^s^ныи и с^s^трашныи, он^s^же не зрить на лица и ни примаеть даровъ, чинѧи сꙋдъ сироте и вдовици, и люб#и пришельца** (Скар., ДЗ, 24 б).

Падкрэсленае слова з’яўляецца назоўнікам роду

A) ніякага; B) жаночага; C) мужчынскага; D) агульнага.

#### Заданне 4

*Выберыце правільны адказ:*

**о ономъ Юлiꙋшꙋ, цѣсарꙋ Римскомъ, читаемо: же егда речъ посполитꙋю Римскꙋю зневолилъ и въ великой части свѣта монархою зосталъ**… (Апокр., 47).

Падкрэсленае слова з’яўляецца назоўнікам роду

A) ніякага; B) жаночага; C) мужчынскага; D) агульнага.

#### Заданне 5

*Адзначце ўсе назоўнікі, якія ў старажытнасці змянілі жаночы род на мужчынскі ў сувязі з пераходам з тыпу скланення на *ĭ ў тып скланення на *ŏ/*jŏ:*

A) вугаль; B) далонь; C) кужаль; D) летапіс; E) матыль; F) насып; G) палын; H) пыл.

## Заданне 6

*Назоўнік* **ѳальшъ** *у старабеларускай мове мог выступаць як у мужчынскім, так і ў жаночым родзе. Вызначце род гэтага назоўніка ў дадзеным кантэксце:*

**ради бы есте тотъ ꙗвныи блuдъ свои, же есте в домu геретическомъ советовали, чымъ кольвекъ покрыли а ижъ правды не стало,** **<u>fальшомъ</u>** **нароблѧють,** (Справ. апіс., **Λ**).

A) мужчынскі; B) жаночы.

## Заданне 7

*Падкрэслены назоўнік запішыце ў назоўным склоне адзіночнага ліку:*

**Протожъ ты** [Каін] **прокл#т$^{s}$ бꙋдеши на земли еже ^вер$^{s}$зе uста сво# и прин#ла кровь брата твоего ^ рꙋкꙋ твои$^{x}$, егда делати бꙋдешъ ее не дасть тобѣ плодꙋ своего,** **<u>Хоронѧкою</u>** **и бегꙋномъ бꙋдеши на земли.** (Скар., КБ, 13 адв. – 14).

## Заданне 8

*Вызначце (запішыце адпаведныя літары) граматычны род і тып скланення падкрэсленага назоўніка ў дадзеным кантэксце:*

[кажаны] **летаючи били на** **<u>тваръ</u>** **людскꙋю, некотории ꙋгризаючи носы, некотории ꙋши ꙋриваючи** (Алекс., 28).

| Род: | Тып скланення: | |
|---|---|---|
| A) агульны; | E) *ŭ; | F) *ĭ; |
| B) мужчынскі; | G) *ā/*jā; | H) *ū; |
| C) жаночы; | I) *ŏ/*jŏ; | J) зычны. |
| D) ніякі. | | |

## Заданне 9

*Выберыце правільны адказ:*

Перабудова шасцітыпнай сістэмы скланення назоўнікаў у трохтыпную звязана з развіццём катэгорыі

A) роду; B) ліку; C) склону; D) зборнасці; E) адушаўлёнасці.

## Заданне 10

*Некаторыя старажытныя назоўнікі маглі выступаць у формах мужчынскага і жаночага родаў, напрыклад,* **носадъ – носада** *('лодка для перавозкі людзей і грузаў'). Пастаўце і запішыце абодва словы ў спрадвечнай форме назоўнага склону множнага ліку.*

## ВАРЫЯНТ II

### Заданне 1

*Выберыце правільны адказ:*

Катэгорыя роду назоўнікаў з’яўляецца

А) лексічнай; В) фармальна-граматычнай; С) формаўтваральнай.

### Заданне 2

*Запішыце словы, з дапамогай якіх вызначецца род падкрэсленага назоўніка:*

**той преднѣйшій бывъ <u>цѣль</u>** – **оказанье невинности нашей, а выкроченья стороны противной** (Апокр., 215).

### Заданне 3

*Выберыце правільны адказ:*

**Кто же кормить <u>обжирце</u> сеи срамоту чинить отцу своему** (Скар., ПС, 42 б).

Падкрэсленае слова з’яўляецца назоўнікам роду

А) агульнага; В) мужчынскага; С) жаночага; D) ніякага.

### Заданне 4

*Выберыце правільны адказ:*

**Ведаешъ и самъ, же <u>патриаръха</u> Ияковъ не за Лию, але за Рахелю такъ долго служилъ и трудилъся;** (Пацей, Адказ клірыку Астр., 484).

Падкрэсленае слова з’яўляецца назоўнікам роду

А) мужчынскага; В) жаночага; С) ніякага; D) агульнага.

### Заданне 5

*Адзначце ўсе назоўнікі, якія ў старажытнасці змянілі жаночы род на мужчынскі ў сувязі з пераходам з тыпу скланення на *ĭ ў тып скланення на *ŏ/*jŏ:*

А) боль; В) даль; С) джала; D) жаль; Е) ка́шаль;
F) мазоль; G) паркаль; Н) подпіс.

### Заданне 6

*Назоўнік* **жаль** *у старабеларускай мове мог выступаць як у жаночым, так і ў мужчынскім родзе. Вызначце род гэтага назоўніка ў дадзеным кантэксце:*

**Грекове не постятъ суботы на памятку оного вѣчного шабату, то естъ отпочыненья въ царествіи небесномъ; а Рымляне постятъ**

**сꙋботы на памяткꙋ <u>жалю</u> и плачꙋ оного апостоловъ Хрыстовыхъ, для погребенья Христова.** (Гарм., 54-Ов).

А) жаночы; В) мужчынскі.

### Заданне 7

*Падкрэслены назоўнік запішыце ў назоўным склоне адзіночнага ліку:*

**птоломѣи воевода радоꙋ и$^{х}$ алексан$^{д}$роꙋ сказалъ. алексан$^{д}$ръ же то слышавъ <u>воискоꙋ</u> свою к собѣ призвавъ** (Алекс., 1 б).

### Заданне 8

*Вызначце (запішыце адпаведныя літары) граматычны род і тып скланення падкрэсленага назоўніка ў дадзеным кантэксце:*

**оные пророческіе слова, коль сла$^{д}$ка <u>гортани</u> моемȣ, слѡвеса твоѧ паче меда оꙋстѡ$^{м}$ мои$^{м}$** (Карп., тыт.).

| Род: | Тып скланення: | |
|---|---|---|
| A) агульны; | E) *ŭ; | F) *ū; |
| B) мужчынскі; | G) *ā/*jā; | H) *ŏ/*jŏ; |
| C) жаночы; | I) *ĭ; | J) зычны. |
| D) ніякі. | | |

### Заданне 9

*Выберыце правільны адказ:*

Перабудова шасцітыпнай сістэмы скланення назоўнікаў у трохтыпную звязана з развіццём катэгорыі

А) склону; В) роду; С) ліку; D) зборнасці; Е) адушаўлёнасці.

### Заданне 10

*Некаторыя назоўнікі ў старажытнасці маглі выступаць у формах мужчынскага і жаночага родаў, напрыклад,* **комодъ** – **комода** *('від мэблі'). Пастаўце і запішыце абодва словы ў спрадвечнай форме назоўнага склону множнага ліку.*

## ВАРЫЯНТ III

### Заданне 1

*Выберыце правільны адказ:*

Катэгорыя роду назоўнікаў заўсёды выражаецца ў

А) канчатках дапасаваных слоў;

В) склонавых канчатках;

С) лексічным значэнні.

## Заданне 2

*Запішыце слова, з дапамогай якога вызначаецца род падкрэсленага назоўніка:*

**И <u>подписъ</u> тутъ естъ васъ некоторыхъ шляхты Волынское, на которую тутъ смотрымъ, черезъ пана Малинъского прынесеный, указуемъ** (Саб. Бер., 6 адв.).

## Заданне 3

*Выберыце правільны адказ:*

**Гды приsде ^ вѣка Азs wка"нна# <u>калѣка</u> жем што могъ позыскати и мало здѣ постpадати** (Зб. 107, 111).

Падкрэсленае слова з'яўляецца назоўнікам роду

A) жаночага; B) ніякага; C) мужчынскага; D) агульнага.

## Заданне 4

*Выберыце правільны адказ:*

**Хоть апостоломъ, хоть <u>евангелистою</u>, хоть пророкомъ, хоть и чимъ колвекъ иншимъ есь**… (Апокр., 197 адв.).

Падкрэсленае слова з'яўляецца назоўнікам роду

A) агульнага; B) мужчынскага; C) жаночага; D) ніякага.

## Заданне 5

*Адзначце ўсе назоўнікі, якія ў старажытнасці змянілі жаночы род на мужчынскі ў сувязі з пераходам з тыпу скланення на *ĭ ў тып скланення на *ŏ/*jŏ:*

A) агонь; B) вопіс; C) вузел; D) каме́ль;

E) накіп; F) перапіс; G) рубель; H) цень.

## Заданне 6

*Назоўнік* **стопьнь** *у старабеларускай мове мог выступаць як у жаночым, так і ў мужчынскім родзе. Вызначце род гэтага назоўніка ў дадзеным кантэксце:*

**Якобы ч̃лвкъ вызволившыся а чистымъ и грѣха порожнимъ будучи, <u>стопня</u> досконалства достuпилъ** (Мак., 74).

A) жаночы; B) мужчынскі.

## Заданне 7

*Падкрэслены назоўнік запішыце ў назоўным склоне адзіночнага ліку:*

**А кгды речъ свою такую сконъчили, ихъ милость Панове послове призвали <u>казнодѣю</u>* корол" его милости велебъного отца (Петра) Скаргу** (Саб. Бер., 13 – г). (*святар, які выступае з казаннем, прапаведнік).

### Заданне 8

*Вызначце (запішыце адпаведныя літары) граматычны род і тып скланення падкрэсленага назоўніка ў дадзеным кантэксце:*

**А если бы кто, покой посполитый взрушаючи, упорне а своволне <u>розрꙋхъ</u> "кій вщиналъ, – тогды абысте... намъ о томъ знати давали конечне** (Апокр., 32).

| Род: | Тып скланення: | |
|---|---|---|
| A) жаночы; | E) *ŭ; | F) *ĭ; |
| B) ніякі; | G) *ū; | H) *ŏ/*jŏ; |
| C) мужчынскі; | I) *ā/*jā; | J) зычны. |
| D) агульны. | | |

### Заданне 9

*Выберыце правільны адказ:*

Перабудова шасцітыпнай сістэмы скланення назоўнікаў у трохтыпную звязана з развіццём катэгорыі

A) адушаўлёнасці; B) зборнасці; C) склону; D) ліку; E) роду.

### Заданне 10

*Некаторыя назоўнікі ў старажытнасці маглі выступаць у формах мужчынскага і жаночага родаў, напрыклад,* **паперъ – папера**. *Пастаўце і запішыце абодва словы ў спрадвечнай форме назоўнага склону множнага ліку.*

## Катэгорыя ліку назоўнікаў

### ВАРЫЯНТ I

### Заданне 1

*Выберыце правільны адказ:*

Граматычная катэгорыя ліку выражала значэнні адзінкавасці, парнасці, множнасці ў:

A) праславянскай, агульнаўсходнеславянскай і старабеларускай мове;

B) індаеўрапейскай мове-аснове, праславянскай і агульнаўсходнеславянскай мове;

C) агульнаўсходнеславянскай, старабеларускай і новай беларускай мове.

## Заданне 2

*Выберыце ўсе правільныя адказы:*

У большасці славянскіх моў парны лік назоўнікаў як асобны самастойны структурны кампанент граматычнай катэгорыі ліку знік. У сучаснасці ў змененым выглядзе ён ужываецца толькі ў мове

A) балгарскай; B) лужыцкай; C) македонскай; D) польскай;
E) сербскай; F) славацкай; G) славенскай; H) украінскай;
I) харвацкай; J) чэшскай.

## Заданне 3

*Выберыце правільны адказ:*

**ѡсадили теж [ж] два быки ѡкрꙋтные, которым [м] теж [ж] ѡгон [н] з гꙋбы шол [л]** (Бельск., 78).

Падкрэслены назоўнік выступае ў форме ліку

A) множнага; B) парнага; C) адзіночнага.

## Заданне 4

*Назоўнік, пададзены ў дужках, пастаўце ў патрэбнай форме. Запішыце атрыманую граматычную форму гэтага назоўніка:*

**и рече Ноеммин̾ь обѣма (сноха) своима идѣта оуба и възвратитасѧ кажждо в дом [м] ѿца своего** (Астр. Бібл., Руф, 1).

## Заданне 5

*Прапанаваныя агульнаўсходнеславянскія назоўнікі пастаўце ў форме назоўнага склону парнага і множнага лікаў. Пад адпаведнымі літарамі запішыце атрыманыя пары слоў:* A) **даръ**; B) **кусъкъ**; C) **око**.

## Заданне 6

*Выберыце сказ, у якім падкрэсленая форма назоўніка паходзіць са старажытнай формы давальна-творнага склону парнага ліку:*

A) Гаварыць далей з дзедам не было ніякага толку, і я, бразнуўшы дзвярыма, што аж затрымцелі ў вокнах шыбы, выйшаў. (Б.Сачанка);

B) Астравок з дарослымі і дзецьмі падобны быў на Ноеў каўчэг: усялякай пачвары па пары – кошкі, сабакі, пеўні, куры. (В.Казько);

C) Усхваляваны гэтым, я з радасцю і ўжо з адчуваннем нейкай асабістай перамогі адшукваю вачамі ўчарашнюю маладую па́ру. (М.Ракітны).

## Заданне 7

*Выберыце сказ, у якім падкрэсленая форма назоўніка паходзіць з адпаведнай формы творнага склону множнага ліку назоўнікаў з былой асновай на $*\bar{a}/*j\bar{a}$:*

A) Алена аднімае далонь ад вачэй і гарачымі бяссоннымі вачыма пазірае ў прарэз дзвярэй на заліты святлом месяца шчарбаты плот, на бярозу пры веснічках. (І.Мележ);

B) Жоны заплакалі рускія ў жальбах нябылых:
“Ўжо нам ні мысляй памысліць мужоў сваіх мілых,
Ані падумаць думай, ні вочмі сваімі
Іх азіраць на пуховай пасцелі жывымі. …” (Я.Купала).

C) Чырвонае карзно-плашч, пераломленае складкамі, здавалася на Войшалку чорным манаскім уборам, глыбокія цені ляжалі пад вачамі – цяпер тужлівымі, пакутнымі, але адначасна і прыязнымі да яе. (В.Іпатава);

### Заданне 8

*Выберыце правільны адказ:*

Старая ўзіраецца ў прыехаўшых людзей, узіраецца да болю ўваччу. (М.Лынькоў).

Падкрэсленае слова паходзіць са старажытнага назоўніка парнага ліку склону

A) назоўна-вінавальна-клічнага;
B) родна-меснага;
C) давальна-творнага.

### Заданне 9

*Выберыце правільны адказ:*

Сучасныя формы назоўнага склону множнага ліку вушы, калені, плечы паходзяць з адпаведных старажытных формаў ліку

A) адзіночнага; B) множнага; C) парнага.

### Заданне 10

*Выберыце правільны адказ:*

Уз’ал’і̋ мы з май̋ім чалав’е́кам м’е́н’шан’кіх на ру́к’і, а бо́л’шан’к’ійа пабра́л’і хустк’е́, закруц’і̋л’іс’а, і стайімо́ ў ха́ц’і. (Нізы, Слонім. р-н // Бел. дыялектал. (хрэст.), с. 209).

Канчатак падкрэсленай дыялектнай формы, якая бытуе ў некаторых гаворках Гродзеншчыны, з’яўляецца рэфлексам старажытнай флексіі **h**:

A) Н.-В. скл. парнага ліку назоўнікаў ніякага роду з асновай на *ŏ;
B) Н.-В.скл. парнага ліку назоўнікаў жаночага роду з асновай на *ā;
C) Н. скл. множнага ліку назоўнікаў жаночага роду з асновай на *jā;
D) В. скл. множнага ліку назоўнікаў жаночага роду з асновай на *jā.

## ВАРЫЯНТ II

### Заданне 1

*Выберыце правільны адказ:*

Граматычная катэгорыя ліку выражала значэнні адзінкавасці, парнасці, множнасці ў:

A) індаеўрапейскай мове-аснове, праславянскай і агульнаўсходнеславянскай мове;

B) праславянскай, агульнаўсходнеславянскай і старабеларускай мове;

C) агульнаўсходнеславянскай, старабеларускай і новай беларускай мове.

### Заданне 2

*Выберыце ўсе правільныя адказы:*

У большасці славянскіх моў парны лік назоўнікаў як асобны самастойны структурны кампанент граматычнай катэгорыі ліку знік. У сучаснасці ў змененым выглядзе ён ужываецца толькі ў мове

A) чэшскай; B) харвацкай; C) украінскай; D) славенскай;
E) славацкай; F) сербскай; G) польскай; H) македонскай;
I) лужыцкай; J) балгарскай.

### Заданне 3

*Выберыце правільны адказ:*

**ѵкрадено в тот часъ два <u>котлы</u> медзяных** (АВК, XXXIX, 203, 1579).

Падкрэслены назоўнік выступае ў форме ліку

A) адзіночнага; B) множнага; C) парнага.

### Заданне 4

*Назоўнік, пададзены ў дужках, пастаўце ў патрэбнай форме. Запішыце атрыманую граматычную форму гэтага назоўніка:*

**Єстли же будет$^{s}$ пра межи (человѣкъ) двема, и досмотрать того сѵдьи...** (Скар., ДЗ, 47).

### Заданне 5

*Прапанаваныя агульнаўсходнеславянскія назоўнікі пастаўце ў форме назоўнага склону парнага і множнага лікаў. Пад адпаведнымі літарамі запішыце атрыманыя пары слоў:* A) **пирогъ**; B) **пиръ**; C) **небо**.

### Заданне 6

*Выберыце сказ, у якім падкрэсленая форма назоўніка паходзіць са старажытнай формы давальна-творнага склону парнага ліку:*

A) Але вось нейкае далёкае храбусценне, занадта яшчэ далёкае, каб быць небяспекай, насцярожвае ласіху. Вось яна стрыганула вушамі, вось наставіла прыгожую морду. (У.Караткевіч);

B) За прыгажосцю ў гэтым свеце палююць гэтак жа, як і за грашыма, за ўладай, за задавальненнямі. (В.Іпатава);

C) Сцежка ад варотцаў была галоўным ходам, па якім хадзілі і, відаць, ездзілі калясьмі. (М.Ракітны).

### Заданне 7

*Выберыце сказы, у якіх падкрэсленая форма назоўніка паходзіць з адпаведнай формы творнага склону множнага ліку назоўнікаў з былой асновай на *ā/*jā:*

A) У вёску, калі вярнуліся нашы, ён [Юрка] бег ужо з лесу сам, несучы за плячыма ў торбачцы разам з сухарамі і падарункі партызан – выразаныя з кары лодачкі, караблікі, скрыначкі… (Б.Сачанка);

B) А вось сяду на свайго службовага буланчыка ды паеду – нават плячамі адчуваю, што моцна сяджу! (М.Ракітны);

C) Так шчыра з ёю ўзяліся дарэчы мы;
Яна ўсё тчэ, а я сучу,
І ўкрадкаю любуюсь яе плечамі,
За белымі грудзьмі сачу. (Я.Купала).

### Заданне 8

*Выберыце правільны адказ:*

Гарбаносы з хітрым і радасным бляскам уваччу паглядзеў на жанчыну. (К.Чорны).

Падкрэсленае слова паходзіць са старажытнага назоўніка парнага ліку склону

A) давальна-творнага;

B) назоўна-вінавальна-клічнага;

C) родна-меснага.

### Заданне 9

*Выберыце правільны адказ:*

Сучасныя формы назоўнага склону множнага ліку вушы, калені, плечы паходзяць з адпаведных старажытных формаў ліку

A) парнага; B) множнага; C) адзіночнага.

### Заданне 10

*Выберыце правільны адказ:*

Майе́ с’астрэ́ ўц’акл’і́ ад н’е́мцаў, а йа асто́ўс’а пры бац’ко́х с са́май мало́чшай с’астро́й М’іхал’і́най. (Куляўцы́, Шчуч. р-н // Бел. дыялектал. (хрэст.), с. 196).

Канчатак падкрэсленай дыялектнай формы, якая бытуе ў некаторых гаворках Гродзеншчыны, з’яўляецца рэфлексам старажытнай флексіі **ѣ**:

A) Н. скл. множнага ліку назоўнікаў жаночага роду з асновай на *jā;

B) В. скл. множнага ліку назоўнікаў жаночага роду з асновай на *jā;

C) Н.-В. скл. парнага ліку назоўнікаў жаночага роду з асновай на *ā;

D) Н.-В. скл. парнага ліку назоўнікаў ніякага роду з асновай на *ŏ.

## ВАРЫЯНТ III

### Заданне 1

*Выберыце правільны адказ:*

Граматычная катэгорыя ліку выражала значэнні адзінкавасці, парнасці, множнасці ў:

A) праславянскай, агульнаўсходнеславянскай і старабеларускай мове;

B) агульнаўсходнеславянскай, старабеларускай і новай беларускай мове;

C) індаеўрапейскай мове-аснове, праславянскай і агульнаўсходнеславянскай мове.

### Заданне 2

*Выберыце ўсе правільныя адказы:*

У большасці славянскіх моў парны лік назоўнікаў як асобны самастойны структурны кампанент граматычнай катэгорыі ліку знік. У сучаснасці ў змененым выглядзе ён ужываецца толькі ў мове

A) славацкай; B) балгарскай; C) чэшскай; D) лужыцкай;

E) македонскай; F) харвацкай; G) польскай; H) украінскай;

I) сербскай; J) славенскай.

### Заданне 3

*Выберыце правільны адказ:*

**тыє <u>дворцы</u> оба два я на сєбє держати маю** (АВК, т. 36, с. 104).

Падкрэслены назоўнік выступае ў форме ліку

A) парнага; B) адзіночнага; C) множнага.

### Заданне 4

*Назоўнік, пададзены ў дужках, пастаўце ў патрэбнай форме. Запішыце атрыманую граматычную форму гэтага назоўніка:*

**ѡнаѧ маргаⷨка ... чаровныє поганскиє слова говорила, проклинала ѡбєма (рꙋка) назадъ кидала** (Барк., 151 б).

**Заданне 5**

*Прапанаваныя агульнаўсходнеславянскія назоўнікі пастаўце ў форме назоўнага склону парнага і множнага лікаў. Пад адпаведнымі літарамі запішыце атрыманыя пары слоў:* A) **волъ**; B) **порогъ**; C) **коло**.

**Заданне 6**

*Выберыце сказ, у якім падкрэсленая форма назоўніка паходзіць са старажытнай формы давальна-творнага склону парнага ліку:*

A) Бацька напрануў дублёнку, надзеў дзіравыя валёнкі і прыстоіў, пакуль Клім вымаў з кішэні ключыкі, ножык, партманэцік з грашамі і старым пер'ем "рондо", каб не згубіць дабро ў лазні. (М.Гарэцкі);

B) Спыніўся, нібы штосьці прыпамінаючы. Утуліў галаву яшчэ глыбей у плечы, часцей заморгаў вачыма і ўсім целам павярнуўся назад. (В.Лапацік);

C) Мужчына быў год пад трыццаць, выключна высокі і добра складзены, з магутнымі пукатымі грудзьмі, трохі гарбаватай, калі сядзеў, спінаю і загарэлай шыяй. (У.Караткевіч).

**Заданне 7**

*Выберыце сказ, у якім падкрэсленая форма назоўніка паходзіць з адпаведнай формы творнага склону множнага ліку назоўнікаў з былой асновай на *ā/*jā:*

A) На яго [сад] цераз чысценькі прадаўгаваты дворык адчыненымі і зачыненымі дзвярамі паглядвалі хлявы, хлевушкі, свіран і другія "дробнаўласніцкія" гаспадарчыя хароміны. (М.Ракітны);

B) Прадсенне перад домам рымскага прэфекта ў Александрыі. Углыбі – рад калумнаў, за імі сцяна з адчыненымі насцеж дзвярмі, заслоненымі да палавіны падвязанай шнурам пурпуровай заслонай. (Я.Купала);

C) Падхапілася, тупнула абцасікам моднай туфелькі і, уся ў слязах, выбегла з кабінета, моцна ляпнуўшы дзвярыма. (Б.Сачанка).

**Заданне 8**

*Выберыце правільны адказ:*

Усё больш і больш пачынала балець у Антона ў душы і ўваччу стаялі то гаспадарка, то Наталля, то дзеці... (М.Ракітны).

Падкрэсленае слова паходзіць са старажытнага назоўніка парнага ліку склону

A) родна-меснага;

B) назоўна-вінавальна-клічнага;

C) давальна-творнага.

### Заданне 9

*Выберыце правільны адказ:*

Сучасныя формы назоўнага склону множнага ліку вушы, калені, плечы паходзяць з адпаведных старажытных формаў ліку

A) множнага; B) адзіночнага; C) парнага.

### Заданне 10

*Выберыце правільны адказ:*

А мы ўс’е́ пападв’а́звайам фартушк’е, кал’і н’ама́ фартушка́ – хустк’е, і ўс’е стайімо́ ў радо́чак. (Вялікія Жухавічы, Карэл. р-н // Бел. дыялектал. (хрэст.), с. 196).

Канчатак падкрэсленай дыялектнай формы, якая бытуе ў некаторых гаворках Гродзеншчыны, з’яўляецца рэфлексам старажытнай флексіі ѣ:

A) Н. скл. множнага ліку назоўнікаў жаночага роду з асновай на *jā;
B) В. скл. множнага ліку назоўнікаў жаночага роду з асновай на *jā;
C) Н.-В. скл. парнага ліку назоўнікаў ніякага роду з асновай на *ŏ;
D) Н.-В. скл. парнага ліку назоўнікаў жаночага роду з асновай на *ā.

# Катэгорыя склону назоўнікаў: адзіночны лік

## ВАРЫЯНТ I

### Заданне 1

*Адзначце ўсе назоўнікі, што мелі праславянскую аснову на зычны:*

A) **врѣмꙗ**; B) **жребии**; C) **звѣрь**; D) **мати**; E) **медъ**; F) **сестра**;
G) **смѣхъ**; H) **стрѣмѧ**; I) **соль**; J) **хлѣбъ**.

### Заданне 2

*Выберыце правільны адказ:*

Назоўнікі з асновай на шыпячыя *ж, ч, ш* першапачаткова скланяліся па варыянту

A) мяккаму; B) цвёрдаму; C) змешанаму; D) не скланяліся.

### Заданне 3

*Вызначце старажытны тып скланення падкрэсленага назоўніка:*

**былъ оу тебе ѡдинъ дѣтина. нашь горожѧнинъ** (Грам. рыжан, 1300 г., 6).

A) *ŭ; F) на зычны (*en);
B) *ū; G) на зычны (*ent);
C) *ĭ; H) на зычны (*er);
D) *ŏ; I) на зычны (*es);
E) *ā; J) на зычны (*men).

### Заданне 4

*Адзначце ўсе сказы, у якіх падкрэслены рознаскланяльныя назоўнікі:*

А) воевода и вси вельможи а иныи многие люди не могли дотиснутис# и жадали только бы видhти ег (Чэцця, 20 б);

В) И хлѣбаръ покладаетъ имъ хлѣбъ по-ряду и брашно, комуждо особно въ сосудахъ (Спісанне, 236 адв.);

С) Тэжъ ωпеку$^{н}$ мае$^{т}$ быти не ве$^{л}$ми зэшлы$^{х}$ летъ не хоры$^{s}$ алѣ ростропъны$^{s}$ розу$^{м}$ны$^{и}$ (Ст. 1566, раздз. 6, арт. а̃);

D) Будуть тежъ волни вси Полоцкіе мещане отъ мыта черезъ все великое княжество Литовское (РИБ, XXVII, 705, 1498);

Е) Вместо митрополита, правитель сынодu ары#нинъ "въныи. (Справ. апіс., Са̃).

### Заданне 5

*Выберыце правільны адказ:*

ωте$^{ц}$... Ꙋпровади$^{л}$ его за собою до ωгорода в которо$^{м}$ было по$^{л}$но насѣꙗно маку (Рым., 796).

Падкрэслены назоўнік ужыты ў спрадвечнай форме роднага склону адзіночнага ліку:

А) так; В) не.

### Заданне 6

*Назоўнік* волъ *пастаўце ў спрадвечнай форме давальнага склону адзіночнага ліку. Запішыце атрыманую словаформу.*

### Заданне 7

*Падкрэсленую словаформу запішыце з другасным, варыянтным канчаткам:*

Єслижъ мы не W$^{т}$пuстимо, W$^{т}$пuщеніа тежъ не достuпимо: поневаж$^{s}$ которою мѣрою мы мhримо, тоеюжъ и намъ W$^{т}$мhрено бuдетъ (Каліст, I, 30).

### Заданне 8

*Пастаўце назоўнік, пададзены ў дужках, у спрадвечнай форме меснага склону адзіночнага ліку. Запішыце атрыманую граматычную форму:*

а ни которымъ дhломъ, ни у (лихо), а ни у добрh не отверечи ми с# корол" (АЮЗР, II, 102, 1386).

### Заданне 9

*Выберыце сказ, у якім падкрэслены назоўнік выступае са спрадвечнай флексіяй клічнага склону:*

А) **Ц҃рь рече. <u>сивилло</u> повѣдаи ми ^кид@ еси тоѹ моѹⷣрость вз#ла хотеⷧ быⷯ того радъ вѣдати.** (Сівіла, p. 44);

В) **и рече к неꙵ ц҃рь. <u>сивилла</u> и почто еси сеⷨ працовала** (Сівіла, p. 20).

### Заданне 10

*Выпішыце назоўнік у клічнай форме:*

Першым разочкам, господнім часочкам. Госпада Бога ўпрашаю, а Прачыстую мамку на помач прызываю. Святая господня, вялікая зара-заранiца, рабы божай (імя, хто замаўляе) памачніца, стань, Госпадзі, на помач, Прачыстая матка, на ратунак, ангелы, на радасць. Я, бабка, славамі, Господзь сваімі думамі… (БНТ, Замовы, с. 316).

## ВАРЫЯНТ II

### Заданне 1

*Адзначце ўсе назоўнікі, што мелі праславянскую аснову на *й:*

А) **верхъ**; В) **врѣмꙗ**; С) **жребии**; D) **звѣрь;** E) **медъ;**

F) **новость**; G) **низъ**; H) **свекры**; I) **сѹдии**; J) **юноша**.

### Заданне 2

*Выберыце правільны адказ:*

Назоўнікі з асновай на заднеязычныя *г, к, х* першапачаткова скланяліся па варыянту

А) мяккаму; В) цвёрдаму; С) змешанаму; D) не скланяліся.

### Заданне 3

*Вызначце старажытны тып скланення падкрэсленага назоўніка:*

**по рожении <u>дитяти</u> не мает ся жена жаⷣное речы в домѹ доⷮкнѹти** (Зб. 752, 530 б).

| | |
|---|---|
| А) *jŏ; | F) на зычны (*en); |
| В) *jā; | G) на зычны (*ent); |
| С) *ŭ; | H) на зычны (*er); |
| D) *ū; | I) на зычны (*es); |
| E) *ĭ; | J) на зычны (*men). |

### Заданне 4

*Адзначце ўсе сказы, у якіх падкрэслены рознаскланяльныя назоўнікі:*

А) **С҃тыи ѡлексѣи быⷧ с҃нь евфимиѧноⷨ моѹжа прешлѧхетного <u>римлѧнина</u> оѹ домѹ цесарскоⷨ первыи** (Жыц. Ал., 1);

В) **Ѻ Галеріи <u>старостѣ</u> читаемъ, же коли передъ его длѧ пытаньѧ о вѣрѣ христіаньской Кіпріана было приведено, тыми словы его пыталъ** (Апокр., 140);

С) **мы паⷦ браⷮ" нине самого <u>законодавца</u> видимъ** (Чэцця, 115);

D) <u>печатари</u> и писары нашы, постерегаючы в томъ достоеⷩство и поваги маестатꙋ нашого... мають того пилновати (Ст. 1588, 21);

E) где насѣнье побожности сѣется, тамъ вⷥпосродкꙋ пшеници кꙋколь свой розⷥсѣваетъ <u>непрiатель.</u> (Адказ клірыку Астр., 5-в);

### Заданне 5

*Выберыце правільны адказ:*

одно крило мѣло пѧт локот и досегало стены <u>домꙋ</u> (Бібл., 415).

Падкрэслены назоўнік ужыты ў спрадвечнай форме роднага склону адзіночнага ліку:

A) не; B) так.

### Заданне 6

*Назоўнік* домъ *пастаўце ў спрадвечнай форме давальнага склону адзіночнага ліку. Запішыце атрыманую словаформу.*

### Заданне 7

*Падкрэсленую словаформу запішыце з другасным, варыянтным канчаткам:*

сотвориⷧ: А҃гглов вѣтрами вихрами, снѣгами, грады, ледами, мразами, зимою, осенью, весною, и <u>жатвою</u>: такъже голосоми, громами и молнiей справючихъ (Хран., 1 б).

### Заданне 8

*Пастаўце назоўнік, пададзены ў дужках, у спрадвечнай форме меснага склону адзіночнага ліку. Запішыце атрыманую граматычную форму:*

кгедимиⷩ... заночоваⷧ в катаⷬгаⷯ зо всиⷨ двороⷨ своиⷨ, на жеглищаⷯ мⷩнованыⷯ на (лꙋка*) свиⷩторозѣ ѿ свиⷩторога кн҃зѧ званоⷥ (Стрыйк., 537). (*лꙋка – выгіб берага; заліў, які ўтвараецца выгібам берага).

### Заданне 9

*Выберыце сказ, у якім падкрэслены назоўнік выступае са спрадвечнай флексіяй клічнага склону:*

A) <u>сыне</u>, ты завше зо мною естесь (Ев. Кал., 86);

B) Болѣи над тые речи <u>сынꙋ</u> мои не пытайсѧ, делающемꙋ многие книги несть ни единаго конца, и частое мышление еⷭ телꙋ мꙋчение (Скар., Екл., 17 адв.).

### Заданне 10

*Выпішыце ўсе назоўнікі ў клічнай форме:*

Госпаду Богу памалюся, святой матухне Прачыстай пакланюся. Прачыста маці да помачы стаці ў раба божага (імя) крыксаў, плаксаў, несаноты шаптаці.

Ідзі ты, крыксівіца, ідзі ты, плаксівіца, ідзі ты, несанота, ідзі ты, недрамота. Печ-матухно, калышы мае дзіцятухно. А стол-бацько, дазірай маё дзіцятко. За гарою крамяною бегла рэчка траскуча, піскуча, ляскуча… (БНТ, Замовы, с. 338).

## ВАРЫЯНТ III

### Заданне 1

*Адзначце ўсе назоўнікі, што мелі праславянскую аснову на зычны:*
*Адзначце ўсе назоўнікі з асновай на *ĭ:*

A) **гость**; B) **гъртань**; C) **дꙗдꙗ**; D) **лодии**; E) **любы**;

F) **отроч#**; G) **печень**; H) **полочꙗнинъ**; I) **сынъ**; J) **ѹспехъ**.

### Заданне 2

*Выберыце правільны адказ:*

Назоўнікі тыпу <u>каравай</u>, <u>край</u>, <u>ратай</u> першапачаткова скланяліся па варыянту

A) мяккаму; B) цвёрдаму; C) змешанаму; D) не скланяліся.

### Заданне 3

*Вызначце старажытны тып скланення падкрэсленага назоўніка:*

**Ворогила <u>ятровь</u> твоя до людѹ своего и до боговъ своихъ** (Хран., 173).

A) *ĭ; F) на зычны (*en);
B) *ŭ; G) на зычны (*ent);
C) *ū; H) на зычны (*er);
D) *jā; I) на зычны (*es);
E) *jŏ; J) на зычны (*men).

### Заданне 4

*Адзначце ўсе сказы, у якіх падкрэслены рознаскланяльныя назоўнікі:*

A) **речет емѹ <u>лютниста</u>, и для того жъ двоякоⁱ ми заплаты бѹдет потреба** (Зб. 259, 315 б);

B) **Пре сей миръ троѹдилиса дъбрии людиѥ. Ролфо. ис кашела биж҃ <u>дворꙗнинъ</u>. тоѹмаше смолнꙗнинъ ажбы миро былъ** (Грам. 1229);

C) **И к томѹ ꙗко сꙗ имамы заховати ко братїи своеи, ꙗко к <u>родителемъ</u>, ꙗко ко стареишимъ. ꙗко ко младшимъ, ꙗко ко немощнымъ, ꙗко ко иноверкомъ, и ꙗко ко всꙗкомѹ человекѹ** (Скар., Апост., 4 б);

D) **естли бы чл҃вкъ простого стани дрѹгого чоловека тежъ простого стани не <u>шлꙗхтича</u> на смерть забилъ** (Ст. 1588, 486);

Е) **Золотарꙋ ѡрганисте пꙋшкарꙋ … доⷭ҇лиде ковалю <u>столꙗрꙋ</u>, псарцꙋ возници, мꙋлꙗрꙋ шеⷡ҇цꙋ гончарꙋ, тыⷨ҇ всиⷨ҇ головщины по триⷣцати копъ грошеи, а навезки по три рꙋбли грошеи** (Ст. 1588, 488).

### Заданне 5

*Выберыце правільны адказ:*

**Забиⷧ҇ тєды П"сⷮ҇ вепра тлuстоⷢ҇ и боⷱ҇кu <u>медꙋ</u> насытиⷧ҇ на им"нины Wноⷢ҇ дhт"ти** (Стрыйк., 604).

Падкрэслены назоўнік ужыты ў спрадвечнай форме Р. склону адз. ліку:

А) так; В) не.

### Заданне 6

*Назоўнік* **вьрхъ** *пастаўце ў спрадвечнай форме давальнага склону адзіночнага ліку. Запішыце атрыманую словаформу.*

### Заданне 7

*Падкрэсленую словаформу запішыце з другасным, варыянтным канчаткам:*

**Wнъ же оуборздh всhⷣ на коⷩ҇ пошоⷧ҇ с малою <u>дроужиною</u>** (Чэцця, 244).

### Заданне 8

*Пастаўце назоўнік, пададзены ў дужках, у спрадвечнай форме меснага склону адзіночнага ліку. Запішыце атрыманую граматычную форму:*

**Како Змиꙗ# прельстила женu Ѧ она "де ^ древа заповеданого и да мꙋжꙋ своемu. W (грехъ) иⷯ о кл#тⷭве божиеи на ниⷯ, И о выгнании ихъ обꙋдвꙋ з раю.** (Скар., КБ, 13).

### Заданне 9

*Выберыце сказ, у якім падкрэслены назоўнік выступае са спрадвечнай флексіяй клічнага склону:*

А) **Сего ради веселисѧ <u>юношо</u> во младости твоеи, и въ добрѣ да прѣбꙋдеть срⷣце твое во днехъ младости твоеѧ** (Скар., Екл., 16 адв.);

В) **Таⷦ҇же и докоⷩ҇ченіе того свhта еклисі#стиⷭ҇. мовиⷧ҇. веселис# <u>юноше</u> в молодости своей.** (Казанне Кір., 149).

### Заданне 10

*Выпішыце ўсе назоўнікі ў клічнай форме:*

Стань ты, Божа маці, стань ты ў помачы рабы божай раджонай (імя) балячку шаптаці. Дзевяці балячок шаптаці, дзевяці прышчэвок шаптаці, дзевяці безвершніц шаптаці і тры балячкі шаптаці: і залезніца, і вэдова, і разава́. …Ты ж балячко, ты гарачко, розавая разавуха, васковая васкаўніца, ты сіняя ты сініца, ты вялікая паненко. Сіні на сіні цвет, рожа на рожы, красны на красны, белы на белы цвет. Я лозу капаю, рожу сею, а рожа не ўзышла, а з нагі (ці рукі) балячка пайшла. (БНТ, Замовы, с. 214).

# Катэгорыя склону назоўнікаў: множны лік

## ВАРЫЯНТ I

### Заданне 1

*Адзначце сказ, у якім падкрэслены назоўнік ужыты са спрадвечнай флексіяй назоўнага склону множнага ліку:*

A) **митрополитъ и владыкове вси, которые тые привиль# в рuкахъ своихъ мели, добре wтомъ ведали и зеzвол#ен# на то.** (Справ. апіс., B);

B) **а дрүгіє, яко простакове, толко на повѣсть людскүю, не вѣдаючы писма, үпорнымъ помагаютъ.** (Унія, 31-**S**г);

C) **послове зъ розныхъ краевъ были** (Апокр., 9);

D) **Ноевы сыновѣ* роз$^{s}$множилис# в$^{s}$ великии народы по потопһ на земли** (Скар., КБ, 21 адв.) (* тут **һ** выступае замест є).

### Заданне 2

*Прапанаваныя назоўнікі мужчынскага роду пастаўце ў форме назоўнага склону множнага ліку. Пад адпаведнымі літарамі запішыце атрыманыя словаформы:* A) **патріархъ**; B) **даръ**; C) **лебедь**.

### Заданне 3

*Выберыце правільны адказ:*

Камяке – тоўчаная бульба, будзям есці камяке з малаком. (Данілавічы, Дзярж. р-н // СБГП-ЗБ, т. 2, с. 393).

Канчатак падкрэсленай дыялектнай формы, якая бытуе ў некаторых цэнтральных і паўднёва-заходніх беларускіх гаворках, з’яўляецца рэфлексам старажытнай флексіі **һ**:

A) В. скл. множнага ліку назоўнікаў з асновай на *jā, які паўплываў на Н. склон назоўнікаў з іншымі асновамі;

B) В. скл. множнага ліку назоўнікаў з асновай на *jŏ, які паўплываў на Н. склон назоўнікаў гэтага ж тыпу;

C) Н.-В. скл. парнага ліку назоўнікаў жаночага роду з асновай на *ā;

D) Н.-В. скл. парнага ліку назоўнікаў ніякага роду з асновай на *ŏ;

E) Н. скл. множнага ліку назоўнікаў з асновай на *jā.

### Заданне 4

*Адзначце сказ, у якім падкрэслены назоўнік ужыты ў спрадвечнай форме роднага склону множнага ліку* (зацвярдзенне [ш’] не ўлічваць!):

A) **внегда uслышиш$^{s}$ шүмъ а онъ идеть по верхү гр8шей, тогда і очнеши бой** (Скар., ДЦ, 75 б);

B) **панъ Гүринъ... побралъ... грүшъ великихъ садовыхъ сүхихъ коробка великая, бочка великая забитая невѣдомо с чимъ** (Пін., 133, 1562).

## Заданне 5

*Назоўнік, пададзены ў дужках, пастаўце ў спрадвечнай форме давальнага склону множнага ліку. Запішыце атрыманую словаформу:*

**Сего ради да приидеть вделъ досто#ни# (сынъ) Ізраилевымъ "коже завещахъ тобh** (Скар., ІН, 27).

## Заданне 6

*Адзначце тып старажытнага скланення, з якога паходзіць канчатак падкрэсленай словаформы творнага слону множнага ліку:*

**Товарыство зас тым ест досконалшое, иж болша ест межы товарышми единост** (Зб. 255, 74).

A) *ŭ; B) *ū; C) *ĭ; D) *ŏ/*jŏ; E) *ā/*jā; F) на зычны.

## Заданне 7

*Назоўнік, пададзены ў дужках, пастаўце ў спрадвечнай форме творнага склону множнага ліку. Запішыце атрыманую словаформу:*

**оучтивши Авраама великими (подаръкъ), казалъ егw зо всими достатки ... въ землю хананейскую проводити** (Хран., 22).

## Заданне 8

*Адзначце сказ, у якім падкрэслены назоўнік ужыты са спрадвечнай флексіяй меснага склону множнага ліку:*

A) **къ тому съ корчомъ дорочныхъ в мѣстѣхъ отъ корчмы по грошей десети** (АВК, III, 273, 1577);

B) **пожегьци ... где бuде$^{т}$ знаидены бuдuть в селе$^{х}$ а любо в месте$^{х}$ немецькы$^{х}$ имають быти ин#ты и выведены** (Вісл., 25 б);

C) **u ме$^{н}$ску и по все$^{s}$ ли$^{т}$ве та$^{м}$ жо$^{л}$нери татарове которые выехали з Швецие$^{s}$ по ты$^{х}$ места$^{х}$ приставство брали** (Барк., 166 б).

## Заданне 9

*Адзначце старажытны тып скланення назоўнікаў, з якога паходзіць канчатак падкрэсленай словаформы меснага склону множнага ліку:*

**которая ведомость и досвятченье пры враде, войте и лавникохъ маеть быти** (КПД, 584, 1557).

A) на зычны; B) *ā/*jā; C) *ŏ/*jŏ; D) *ŭ; E) *ū; F) *ĭ.

## Заданне 10

*Адзначце ўсе сказы, у якіх падкрэсленыя назоўнікі меснага склону множнага ліку маюць канчаткі, што паходзяць з былога скланення на *ā/jā:*

A) Кляравецкая хустка ўся ў кветках. Бывая вялікая і меншая, не разбярэш за кветкамі, якое поля, бо яна ўся ў <u>цвятох</u>, цвяты драбнаватыя. (Бакшты, Іўеўскі р-н // СБГП-ЗіП);

B) Не дакарала, не журыла
Ні ў цішыні, ні пры <u>гасцях</u>. (Я.Янішчыц);

C) Часам сівыя, мутныя, дымныя болкі разбягаліся ў бакі, згруджываліся па <u>краёх</u> уаграмадныя, чорныя, з белаватымі прасветамі аблокі. (М.Гарэцкі);

D) Дзед і ўнукі застылі на месцы за карчом-вываратнем. Іх позіркі таропіліся ў адзін пункт на вяршыні ўзгорка, і страх смерці цямнее ў іх <u>вачах</u>. (З.Бядуля).

## ВАРЫЯНТ II

### Заданне 1

*Адзначце сказ, у якім падкрэслены назоўнік ужыты са спрадвечнай флексіяй назоўнага склону множнага ліку:*

A) **А вы єстє <u>свѣткове</u> томꙋ** (Аб адзінай веры, 7 адв.);

B) **Коли <u>болгарове</u> на цесара пришли, волѣл ся з ними ȣгажат даючи им дорочныи доходы** (Бельск., 343 б);

C) **нєровоам поднеслъ войнꙋ противъ панꙋ своємꙋ, а скꙋпилися до нєго мꙋжевє никчемни и <u>сыновє</u> злочинства** (Бібл., 431);

D) **таковых речей <u>воєводовє</u>, старостовє, и дєржавъцы наши кождый в дєржаве своей мають досмотрати** (Ст. 1588, 38).

### Заданне 2

*Прапанаваныя назоўнікі мужчынскага роду пастаўце ў форме назоўнага склону множнага ліку. Пад адпаведнымі літарамі запішыце атрыманыя словаформы:* A) **посохъ**; B) **волъ**; C) **гость**.

### Заданне 3

*Выберыце правільны адказ:*

З тэртоі картошкі качаюць такэі шарыкі, з молоком і бэз молока <u>палюхе</u> бываюць. (Олтуш, Малар. р-н // ДСБ, с. 161)

Канчатак падкрэсленай дыялектнай формы, якая бытуе ў некаторых цэнтральных і паўднёва-заходніх беларускіх гаворках, з'яўляецца рэфлексам старажытнай флексіі **ѣ**:

A) Н. склону множнага ліку назоўнікаў з асновай на *jā;

B) Н.-В. скл. парнага ліку назоўнікаў жаночага роду з асновай на *ā;

C) Н.-В. скл. парнага ліку назоўнікаў ніякага роду з асновай на *ŏ;

D) В. скл. множнага ліку назоўнікаў з асновай на *jŏ, якія паўплывалі на Н. склон назоўнікаў гэтага ж тыпу;

E) В. скл. множнага ліку назоўнікаў з асновай на *jā, якія паўплывалі на Н. склон назоўнікаў з іншымі асновамі.

### Заданне 4

*Адзначце сказ, у якім падкрэслены назоўнік ужыты ў спрадвечнай форме роднага склону множнага ліку* (зацвярдзенне [ц’] не ўлічваць!) *:*

A) **Не радимъ, и овшемъ верꙋ старыхъ отцовъ вашихъ и нашихъ змоцнить, и одъ ересий и блꙋдовъ новыхъ Грековъ оборонить хочемъ!** (Саб. Бер., 54 адв.);

B) **Пороскопывали есте гробы продковъ, порꙋшили есте кости отецъ, в$^{ѕ}$згордили есте ихъ вѣрꙋ, ... затмили есте ихъ пресвѣтлꙋю славꙋ.** (Отпіс клірыку Астр., 17-е).

### Заданне 5

*Назоўнік, пададзены ў дужках, пастаўце ў спрадвечнай форме давальнага склону множнага ліку. Запішыце атрыманую словаформу:*

**Тыхъ зас видомыхъ багатствъ достаток шкоди рачей а нижли пожиток (кохан҄ъкъ) своимъ приносит** (Варл., 160).

### Заданне 6

*Адзначце тып старажытнага скланення, з якога паходзіць канчатак падкрэсленай словаформы творнага слону множнага ліку:*

**до домовъ своихъ коньми волостъными не маютъ отвозити** (КПД, 72, 1529).

A) *ā/*jā; B) *ŏ/*jŏ; C) *ŭ; D) *ū; E) *ĭ; F) на зычны.

### Заданне 7

*Назоўнік, пададзены ў дужках, пастаўце ў спрадвечнай форме творнага склону множнага ліку. Запішыце атрыманую словаформу:*

**Ꙋделъ ровный в ыменью ѿчызномъ межы (сынъ) бꙋдетъ** (Ст. 1588, 291).

### Заданне 8

*Адзначце сказ, у якім падкрэслены назоўнік ужыты са спрадвечнай флексіяй меснага склону множнага ліку:*

A) **по нѣкоторы$^{х}$ теды лѣта$^{х}$ на тых гора$^{х}$ по пророче$^{с}$твию и благо$^{с}$ловению ѡ҃ого заложено и збꙋдовано кие$^{в}$ мѣсто** (Зб. 82, 201);

B) **межи ними былъ иларионъ в летѣхъ молодыхъ, але въ великихъ цнотах, доскональый, досталый** (Пралог, 671);

C) **да$^{л}$ емꙋ все кнѧ$^{з}$ство реза$^{н}$ское з до$^{ч}$кою в справꙋ мо$^{ц}$ и панова$^{н}$е бꙋдꙋчи са$^{м}$ в зешлых лѣте$^{х}$** (Стрыйк., 536).

## Заданне 9

*Адзначце старажытны тып скланення назоўнікаў, з якога паходзіць канчатак падкрэсленай словаформы меснага склону множнага ліку:*

**несите на раменохъ вашихъ по числу сыновъ ізраилевыхъ да будȣть во знаменія межи вами** (Скар., ІН, 10).

